# Раённая алімпіяда па беларускай мове
# 9 клас

1. **Якія гукі выконваюць ролю адрознівальнікаў сэнсу ў наступных парах слоў. Запішыце.**

| | |
|---|---|
| а) бэз – без; | д) ваду – вяду; |
| б) дзірка – бірка; | е) дровы – бровы; |
| в) жылі – шылі; | ж) воз – вось; |
| г) сон – сын; | з) яма – мама. |

(0,5 б)

2. **Запішыце словы па-беларуску ў алфавітным парадку.**

Смазывать, представительство, боярышник, скамья, созвездие, езженный, неосмотрительный, златоцвет, бездельник, ромашка, кучер.

(4 б)

3. **Адзначце сказы з няправільным ужыванне дзеепрыслоўяў.**
   1) Падняўшы ўгору твар, хлопчык доўга слухаў перазвон жаўрукоў.
   2) Імкнучыся выканаць заданне, у брыгадзе значна ўзрасла працоўная дысцыпліна.
   3) Супакоіўшыся, ён пачаў думаць пра сваё становішча.
   4) Радасць так і свяцілася ў вачах, успомніўшы пра тое нядаўняе вяселле.

(2 б)

4. **Па прапанаваным пачатку ўзнавіце і запішыце прыказкі.**
   1) Няма смачнейшай вадзіцы, ...
   2) Вуснамі мёд разлівае, ...
   3) У людзей пытай, ...

(3 б)

5. **Складзіце сказы, у якіх неазначальная форма дзеяслова <u>жыць</u> выконвала б сінтаксічную ролю: а) дзейніка; б) выказніка; в) азначэння; г) акалічнасці.**

(4 б)

6. **Пастаўце ў форме творнага склону словазлучэнні.**

Горад Рагачоў, пісьменнік Лужанін, горад Шчучын, паэт Куляшоў.

(2 б)

7. **Запішыце па тры-чатыры словы (выразы) ветлівасці, якія прынята ўжываць пры сустрэчы, а потым – пры развітанні.**

(выраз – 0,5 б)

8. **Прачытайце загадкі, у якіх ідзе гаворка пра органы маўлення. Запішыце ў табліцу, з чым параўноўваюцца *язык, зубы, рот*.**

| Органы маўлення | З чым параўноўваюцца |
|---|---|
| язык | |
| зубы | |
| рот | |

1) За белым бярэзнічкам талалай брэша.
2) За сцяною касцяною балалайка грае.
3) Злодзей у клетцы, а мяшкі на парозе.
4) Ляжыць калода пасярод балота, ні гніе, ні сохне.
5) Поўны падпечак белых авечак.
6) За саначкамі, за белым бярэзнічкая у сваёй бярлозе мядзведзь ляжыць.

(4 б)